ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 4 2005
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 882.6(092)Багдановіч+882.6.015+882.6.09*

*Т. І. ВАБІШЧЭВІЧ*

# ЛІТАРАТУРНАЯ ТРАДЫЦЫЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА ЯК ІДЭЙНА-ЭСТЭТЫЧНАЯ ПРАГРАМА

*Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 29.06.2004)*

«Усякі выясніўшыйся, абасобніўшыйся пісьменнік, — пісаў Максім Багдановіч у артыкуле-аглядзе «Глыбы і слаі» (1911), — хоць бы праз адно гэта стаіць на крок уперадзе пісьменнікаў-аднаднёвак, вабіць іх сваёй яркасцю, як аганёк матылькоў, і, прывабіўшы, гуртуе вакол сябе, творыць літаратурны кірунак» [2, с. 185]. У працытаваным выказванні, па сутнасці, акрэсліваюцца механізмы, паводле якіх нацыянальная літаратурная традыцыя ўзбагачаецца новымі ідэйнымі і мастацка-фармавымі элементамі. Згодна з М. Багдановічам, арыгінальныя творчыя напрацоўкі па-сапраўднаму таленавітага аўтара, што мае «больш-менш асабістыя колеры» і не зліваецца з «аднакалёрным слоем» [2, с. 185] літаратурных сучаснікаў, падхопліваюцца іншымі пісьменнікамі і таму выступаюць у якасці асновы для фарміравання адметнай літаратурна-мастацкай плыні.

Сёння як неаспрэчны факт успрымаецца сцверджанне, што творчасць самога Максіма Багдановіча ў XX стагоддзі адыграла для некалькіх пакаленняў нацыянальных аўтараў ролю магутнага арыенціра. Без літаратурных традыцый, закладзеных паэтам, шмат якія дасягненні беларускага прыгожага пісьменства былі б немагчымымі. Ідэйна-эстэтычны патэнцыял Багдановічавай спадчыны і цяпер застаецца нявычарпаным. Прычыны такога моцнага ўздзеяння М. Багдановіча на развіццё нацыянальнай літаратуры хаваюцца, на нашу думку, у адметнасці паэтавага погляду на сутнасць і функцыі літаратурна-паэтычнай творчасці. Раскрыем, у чым заключаецца гэтая адметнасць.

Тое, што Максім Багдановіч істотна выбіваўся з агульнай плыні літаратурнага працэсу пачатку XX ст. падкрэслівалі ў розны час многія даследчыкі паэтавай літаратурнай дзейнасці (у І. Навуменкі, напрыклад, чытаем: «[...] паэтыка Багдановіча істотна адрозніваецца ад творчых прынцыпаў Купалы і Коласа. [...] не варта [...] «падганяць» Багдановіча пад Купалу, Коласа, бо ў яго зусім іншая творчая задача, эстэтычная канцэпцыя» [9, с. 21]). «Абасобленасць», «выяўленасць» сваёй пазіцыі на фоне тагачасных аўтараў выразна ўсведамляў і сам творца. У кароткай і, трэба заўважыць, вельмі крытычнай самахарактарыстыцы, пададзенай у тым самым аглядзе «Глыбы і слаі», Багдановіч наўпрост адзначае, што ў напісаным ім «асобнасці [...] таленту выступаюць ужо даволі ясна» [2, с. 190]. Трапнасць і аб'ектыўнасць ацэнак, якія ў гэтым і ў іншых крытычных артыкулах («За тры гады: Агляд беларускай краснай пісьменнасці 1911—1913 гг.», «Беларускае адраджэнне»), роўна як і ў эпісталярнай спадчыне, дае паэт сваёй лірыцы, сведчаць пра пастаянную творчую самарэфлексію. Трывалая схільнасць да самааналізу і ўласцівая М. Багдановічу мастацкая «рацыяналістычнасць» (неаднойчы падкрэсленая даследчыкамі), яго імкненне «ў творчасці усё [...] паняць [...], абдумаць спосабы, і матар'ял, і мэту» [1, с. 263] з'яўляюцца дастатковымі падставамі, каб сцвярджаць: паэт падпарадкаваў «спакойнай думе» не толькі кожны канкрэтны твор, дасягаючы праз гэта дасканаласці формы, але ўсю сваю літаратурную дзейнасць.

Максім Багдановіч стаў, па сутнасці, першым з беларускіх аўтараў, хто падышоў да мастацкай творчасці мэтанакіравана і сістэмна — як і належыць творцу-прафесіяналу. «Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе гэтага слова» (К. Чорны) [12, с. 368], паэт умеў «слухаць час» (М. Стральцоў) [11, с. 217]. Зыходзячы з вывучэння патрэб і ўмоў беларускай культурнай сітуацыі, М. Багдановіч на пэўным этапе мастацка-паэтычнай працы (трэба меркаваць, ужо ў 1910—1911 гг.) усвядоміў неабходнасць распрацоўкі і стварыў цэлас-

ную, шматбаковую праграму, скіраваную на развіццё нацыянальнай літаратуры. Ён дакладна вызначыў ідэйна-эстэтычныя мэты і задачы сваіх творчых пошукаў і паслядоўна працаваў у абраных кірунках. Паэт свядома падыходзіў да пытанняў пра што, як і дзеля чаго пісаць. «Роздум, які ставіць задачы, напорыстая, скрупулёзная праца, якая іх вырашае, — вось адна з першасных нязменных і неразменных асноў паэзіі Багдановіча» [8, с. 138]. У Багдановічавай спадчыне — пры ўсёй яе знешняй разнароднасці і шматстайнасці — «раптоўнага няма». Створанае паэтам у галіне беларускай літаратуры, крытыкі і публіцыстыкі ўяўляе сістэмнае ўтварэнне, дзе кожны складнік выконвае пэўныя мастацкія і сацыяльна-культурныя функцыі, адначасова працуючы на дасягненне адзінай, цэнтральнай мэты.

Тут дарэчы будзе адзначыць яшчэ адзін момант, які ўскосна ўказвае на правамернасць разгляду літаратурнай традыцыі М. Багдановіча як цэласнай праграмы. Пошук галоўнага чынніка творчасці, што «аб'ядноўвае ў стройнае цэлае (і, значыць, вытлумачвае) усе істотныя элементы творчага «я», сам Максім Багдановіч лічыў першачарговай, «асноўнай задачай літаратурнай крытыкі», на якую «павінны быць накіраваны ўсе яе намаганні» [2, с. 304]. Невыпадкова, што большасць Багдановічавых артыкулаў (і агляды маладой беларускай літаратуры са сціслымі, але заўжды вельмі дакладнымі ацэнкамі кожнага аўтара, і больш разгорнутыя матэрыялы, прысвечаныя ўкраінскім і рускім пісьменнікам) пабудаваны якраз на гэтым прынцыпе. Багдановіч-крытык імкнецца назваць самыя характэрныя, вызначальныя для канкрэтнага аўтара творчыя асаблівасці — «рухаючую спружыну» [2, с. 323], «асноўную рухаючую сілу», веданне якой дае «разгадку» таленту і прадстаўляе «сам талент у выглядзе стройна, заканамерна арганізаванага цэлага» [2, с. 316].

Спалучаючы ў сабе паэта-практыка і даследчыка літаратуры, Максім Багдановіч не мог не экстрапаліраваць зробленыя крытычныя высновы на ўласную творчасць ці (і гэта болей імаверна) агучваць у артыкулах тое, што апрабаваў ва ўласнай паэтычнай дзейнасці і чаму знайшоў пацвярджэнне ў творчасці іншых аўтараў. На наш погляд, многія артыкулы М. Багдановіча — гэта яго ўскосная рэфлексія над уласнай мастацкай практыкай. Навукова-тэарэтычныя і крытычныя артыкулы дадаюць недастатковыя «рацыянальныя» цагліны да таго гмаху, што ўяўляе сабою літаратурная традыцыя паэта як «заканамерна арганізаваная», сістэмна аформленая ідэйна-эстэтычная праграма. Не ўлічыць выказаныя Максімам Багдановічам ідэі пры разглядзе яго паэтычнай спадчыны было б памылкай.

Аналіз створанага Багдановічам на літаратурна-крытычнай ніве дазваляе вылучыць некалькі значных у канцэптуальным плане момантаў, якія ў розных кантэкстах неаднаразова паўтараюцца паэтам. Яны знаходзяць праяўленне і ў мастацкіх тэкстах, перацякаючы туды ў якасці тэм, праблем, матываў, агульных прынцыпаў творчай працы. Такім чынам, менавіта гэтыя вузлавыя канцэпты выступаюць адначасна і як асноўныя маркеры Багдановічавай паэтычнай практыкі, што найлепшым чынам адлюстроўваюць характарыстыкі, уласцівыя паэтаваму таленту. Пры больш пільным поглядзе выяўляецца цесная сувязь гэтых ідэй паміж сабой: усе яны датычацца творчага працэсу і сутнасці паэзіі як своеасаблівага роду чалавечай дзейнасці. Назавём стрыжнёвыя Багдановічавы канцэпты, каротка праілюструем іх цытатамі, пакажам сувязь з мастацкай практыкай паэта і дадзім сціслы каментарый адносна іх зместавай напоўненасці.

*Высокамастацкасць, эстэтычная вартасць вершаванай прадукцыі* — цэнтральнае патрабаванне, якое Багдановіч прад'яўляе да дзейнасці паэта. Не колькасны рост, а ў першую чаргу якасць цікавіць строгага крытыка, калі ён піша пра зрухі ў беларускай «краснай» пісьменнасці за 1911—1913 гг. [2, с. 223]. І менавіта гэты крытэрый — асноўны пры ацэнцы любога мастацкага твора. Напрыклад, Якуба Коласа Багдановіч адзначае як пісьменніка «ўсюды сабе роўнага»: «заўсягды можна быць запэўненым у вартасці яго твораў» [2, с. 224]. Ад сябе паэт заўжды вымагаў «мазольнай працы» [10, с. 16] над вершам, давядзення яго да формавай дасканаласці. Другі аспект высокамастацкасці ў Багдановічавым разуменні звязаны са змястоўным напаўненнем твора. Такая двухаспектнасць на тэарэтычным узроўні знаходзіць абгрунтаванне ў тым, як паэт раскрывае паняцце зместу: «[...] пад зместам твора ў суб'ектыўным сэнсе трэба разумець ўражанне, якое пакідае дадзеная рэч; а ў аб'ектыўным сэнсе — сукупнасць элементаў, якія ствараюць гэтае ўражанне» [2, с. 309]. Такім чынам, для паэта сама мастацкая форма («сукупнасць элементаў, якія ствараюць уражанне») — змястоўная. І сутнасць «чыстай красы», уласцівай Багдановічавай спадчыне, трэба разумець як сукупнасць двух непарыўна звязаных паміж сабою творчых прынцыпаў: па-першае, майстэрства ўбачыць, знайсці і «сілай пачуцця» выплавіць з «кавалку грубага жыцця» [1, с. 124] прыгожае, непаўторнае, вечнае, па-другое, здольнасць надаць паэтычнай думцы мастацкую завершанасць. У «пекнасці»,

«праўдзівым уменні» і «вялікім пад'ёме пачуцця» [2, с. 223—224] бачыць Багдановіч высокамастацкасць. І ў гэтым каштоўнасць паэзіі. Адсюль вынікае думка пра першаснасць эстэтычнага ў паэтычным творы, пра самадастатковасць мастацкага слова. «Літаратура, несумненна, і выхоўвае і вучыць, — піша М. Стральцоў, аналізуючы Багдановічавы погляды на сутнасць паэзіі, — але [...] толькі тады, калі застаецца літаратурай у арганічным сэнсе гэтага слова. Прызначэнне літаратуры перш за ўсё — даследаваць жыццё, даследаваць адпаведна сваім, закладзеным у ёй законам» [11, с. 229].

*Індывідуалізаванасць стылю і зместу, «абасобленасць» таленту* — яшчэ адна абавязковая, паводле М. Багдановіча, умова мастацка-эстэтычнай вартасці твораў. «[...] Канстанцыя Буйла абяцае развіцца ў праўдзівы асабісты талент» [2, с. 190]; «Няма сумневу, што талент С. Д. Дрожжына і не вялікі, і не самастойны» [2, с. 222]; «Галоўнае ж тое, што [...] А. Гарун ні да каго іншага не падобны, што ён не зрабіўся нічыім «падгалоскам». Гэта зарука, што нашы надзеі на яго талент не пойдуць намарна» [2, с. 225] — прыведзеныя цытаты сведчаць, наколькі істотным было для М. Багдановіча самавыяўленне праз творчасць, наяўнасць у вершах «асобаснай эмоцыі» (І. Навуменка) [9, с. 3]. Творца павінен культываваць у сваім таленце найбольш індывідуальныя стылёва-формавыя і тэматычна-змястоўныя рысы, бо менавіта ў творчай самабытнасці — каштоўнасць кожнага пісьменніка для нацыянальнай літаратуры.

*Усвядомленасць (рацыяналізм) творчай працы* — сродак, праз які можа быць дасягнуты высокі мастацкі ўзровень твораў, а таксама, у пэўнай меры, і «абасобленасць» таленту. У артыкуле «Паэзія геніяльнага вучонага» (1911) Багдановіч адзначае агульнасць мэты навукі і паэзіі — «задавальненне пазнавальнай патрэбы чалавека», падкрэслівае блізкасць навуковых і паэтычных метадаў: « [...] у паэзіі пераважае стыхія інтуіцыі, а ў навуцы роздумнасць, якая няспешна зляплівае адну выснову з іншай. Але апошняя не чужая і паэтычнай творчасці, а інтуіцыя ў навуковых адкрыццях грае вялікую ролю» [2, с. 195]. Вядома таксама імкненне паэта стварыць «метад навуковай крытыкі» [2, с. 422]. Найбольш жа поўна плённасць рацыянальнага стаўлення да мастацкай працы праявілася ў паэтычнай практыцы М. Багдановіча, дзе — як у плане вершаванай тэхнікі, так і ў плане сэнсавага напаўнення твора — «думка не замінае пачуццю, а пачуццё думцы» [11, с. 224].

*Прафесіяналізм творцы* — неабходная, згодна з М. Багдановічам, перадумова мастацкай дзейнасці. Тут у цесны вузел звязваюцца паміж сабою ўсе пералічаныя намі вышэй моманты. Прафесійны погляд на літаратуру, гэта значыць погляд, калі паэт усведамляе сваю творчую адказнасць перад нацыянальнай культурай, вызначае мэты і задачы паэтычнай дзейнасці, калі разумее значнасць тэарэтычных ведаў пра літаратуру і неабходнасць напружанай працы над кожным творам, — толькі такі погляд забяспечвае развіццё мастацкага слова. Спецыфічнасць культурна-гістарычных умоў пачатку XX ст., калі большасць беларускіх аўтараў былі паэтамі-самавукамі, вымагала падкрэсліваць значнасць прафесіяналізму для паспяховага функцыянавання нацыянальнай літаратуры. Галоўную бяду беларускага мастацкага слова М. Багдановіч бачыў якраз у тым, што ў Беларусі доўгі час адсутнічалі і высокаадукаваныя чытачы (для якіх літаратура на роднай мове была б «хлебам духоўным», а не «простым дадаткам да літаратуры польскай або велікарускай»), і прафесійныя творцы — «былі толькі *аматары* беларускага пісьменства» [2, с. 267].

*Няспынны творчы пошук, развіццё, рух наперад* — патрабаванне да мастака слова, якое Багдановіч выводзіць з асаблівасцей тагачаснай беларускай літаратурнай сітуацыі і са свайго разумення сутнаснай якасці мастацтва — «вечна абнаўляцца і паўставаць у надзвычайна выразнай суаднесенасці эстэтычных форм з грамадскімі ідэаламі эпохі» [5, с. 3]. Разам з тым, ідэя няспыннасці творчага пошуку, пастаяннага самаўдасканалення завяршае, змацоўвае ідэйную структуру Багдановічавых поглядаў на літаратуру як адметны духоўна-эстэтычны феномен. Побач з ацэнкай мастацкай вартасці твораў, рух, развіццё паслядоўна выступаюць у Багдановіча крытэрыем ацэнкі дзейнасці таго ці іншага аўтара. Так, у аглядзе 1911 г. знаходзім: Я. Купала звяртае на сябе ўвагу «не толькі велічынёй сваёй здольнасці, але гібкасцю яе, здатнасцю да ўсестаронняга развіцця. Гэта бадай адзіны наш пісьменнік, каторы ідзе ўперад, вядзе нейкую ўнутраную працу, і, зрабіўшы ці мала, не супыняецца аж да гэтага часу» [2, с. 185—186]; у кнізе Я. Коласа «Песні жальбы» ёсць «якаясь акамянеласць: на працягу аж 4-х гадоў Колас не зрабіў значнага кроку ўперад і ў самых апошніх вершах пяе аб тым жа, што і ў пачатку сваёй працы» [2, с. 188]; «што да Багдановіча, то ў ім непрыкметна шпаркага развіцця» [2, с. 190]; у артыкуле «За тры гады»: «З радасцю бачым, што талент Купалы развіваецца, з'яўляюцца новыя мэты, новыя спосабы творчасці, новыя формы і вобразы» [2, с. 223]; аналізуючы творчасць М. Лермантава, Багдановіч заўважае: «Творачы, пішучы, ён надаў свайму таленту

надзвычайную мастацкую магутнасць, глыбіню і выразнасць, але амаль не рассунуў яго межаў у шырыню. [...] Так білася самотная душа Лермантава ў коле аднастайных перажыванняў, перапварыўшых яго творчасць у нейкае «паўтарэнне пройдзенага» [2, с. 250, 252]. Катэгарычнасць, з якою гучаць працытаваныя ацэнкі, вытлумачваецца імкненнем Максіма Багдановіча зноў і зноў падкрэсліваць неабходнасць «не таптацца на адным месцы, а расці і ўшыр і ўглыб» [2, с. 185]. Паэт разумеў, што творчасць — гэты вечны пошук. Тым болей развіццё форм, тэм, прыёмаў, вобразаў было важнае для маладой беларускай літаратуры, дзе «кожны кірунак можа мець цэннасць».

Такім чынам, мы выявілі галоўныя вузлавыя моманты, якія адлюстроўваюць Багдановічаў погляд на паэзію і ўтвараюць ідэйны каркас паэтавай літаратурнай традыцыі. Калі звесці вышэйсказанае ў адно, сувязі паміж гэтымі вузлавымі момантамі могуць быць выражаны наступным лагічным ланцужком. Паводле М. Багдановіча, паэзія — самакаштоўны духоўны феномен, сутнасць якога — эстэтычная; здзяйсненне верша як эстэтычнай з'явы немагчымае без «чыстай красы» твора — адпаведнага ідэйна-тэматычнага напаўнення і надання гэтаму напаўненню дасканалай формы; высокамастацкасць паэзіі немагчыма без творчай арыгінальнасці, здольнасці аўтара выявіць сваю індывідуальнасць як праз ідэйна-тэматычнае напаўненне, так і праз мастацкую форму твора; шлях да дасягнення высокай эстэтычнай вартасці паэзіі — рацыянальнае, прадуманае стаўленне да паэтычнай дзейнасці; прафесіяналізм у паэзіі — квінтэсенцыя ідэі пра свядомасны падыход да вершатворчасці, прычым прафесіяналізм уключае ў сябе абавязковае разуменне паэтам эстэтычна-інтуітыўнай сутнасці мастацтва, а значыць, і недапушчальнасць звядзення творчага працэсу да механічнай працы; рух, няспынны пошук новых форм, тэм, жанраў — заклад захавання эстэтычна-творчай сутнасці паэзіі.

Як відаць з прыведзенага ланцужка ідэй, погляды Максіма Багдановіча на сутнасць і метады паэтычнай дзейнасці ў кантэксце сусветнай філасофска-эстэтычнай думкі не вызначаюцца прынцыповай навізною. Наадварот, усе яны гучаць як неаспрэчныя мастацкія аксіёмы, здаўна вядомыя ў еўрапейскіх літаратурах. Адсюль вынікае, што ў сваёй мастацкай і літаратурна-крытычнай дзейнасці паэт, улічыўшы спецыфічныя патрэбы і задачы нацыянальнай літаратуры, укараніў на беларускай глебе тыя класічныя пастулаты, якімі на працягу стагоддзяў кіравалася еўрапейскае паэтычнае мастацтва. За плячыма М. Багдановіча стаялі дасягненні еўрапейскай эстэтычнай тэорыі і практыкі, на іх ён грунтаваўся і менавіта яны ўтварылі аснову літаратурнай традыцыі паэта (нездарма англійская даследчыца і перакладчыца В. Рыч, ураджаная адданасцю М. Багдановіча ідэям «еўрапейскасці» і «універсальнасці», нават задалася пытаннем, наколькі яго «сапраўды можна лічыць беларускім паэтам» [13, с. 43]).

Ідэйны каркас праграмы М. Багдановіча, галоўныя вузлавыя канцэпты якой мы каротка ахарактарызавалі вышэй, апрабаваны, такім чынам, усёй гісторыяй еўрапейскага мастацтва. Цэнтральныя палажэнні Багдановічавай літаратурнай традыцыі сфарміраваліся пад уплывам класічнай філасофска-эстэтычнай парадыгмы. У гэтым плане слушная заўвага М. Стральцова: «[...] Багдановіч — класік, як ніхто з нашых класікаў» [11, с. 251]. Прычым у дачыненні да Багдановіча паняцце класічнасці звязана ў першую чаргу «з характарам адносін мастака да рэчаіснасці, з вызначэннем ім ролі мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, са здатнасцю разумець мастацтва як сацыяльную, культурную і нацыянальную з'яву адначасова» [11, с. 251].

Такім чынам, Багдановіч акрэсліў шлях, ідучы якім нацыянальная літаратура беларусаў зноў далучыцца да развіцця еўрапейскага мастацтва, стане актыўным удзельнікам і фармавальнікам агульнаеўрапейскага літаратурна-мастацкага працэсу, панясе свой дар «усясветнай культуры» [2, с. 229]. Уласнай мастацкай практыкай паэт паказаў, што універсальныя эстэтычныя ідэі могуць набываць нацыянальнае гучанне, напаўняцца беларускім духам (і гэта — адказ на запытанне В. Рыч). Вяртанне беларускага прыгожага пісьменства ў рэчышча еўрапейскага літаратурнага працэсу — вось, на наш погляд, галоўная мэта, якую ставіў перад сабою, сваімі сучаснікамі і наступнікамі Максім Багдановіч. Канцэпцыя еўрапеізацыі беларускага мастацкага слова стала тым стрыжнем, той асноўнай «рухаючай спружынай», што надала адзінства і цэласнасць літаратурнай традыцыі паэта.

Калі б развіццё прафесійнага беларускага прыгожага пісьменства не было гвалтоўна перапынена ў канцы XVII—XVIII ст., на самым пачатку свайго станаўлення, у 1900—1910-я гг. не ўзнікла б неабходнасці вяртацца да «эстэтычных вытокаў» — ізноў упісваць беларускую літаратуру ў рэчышча еўрапейскай класічнай інтэлектуальна-культурнай традыцыі. Але гэткае своеасаблівае, запозненае, вяртанне да «першакрыніцаў» мастацтва адначасова было стымулам, каб хутчэй ісці наперад. Паводле слушнай думкі Р. Бярозкіна, «місія Багдановіча ў тым і заключалася, каб нястомна [...] паказваць роднаму мастацтву, роднай паэзіі тыя магчымасці,

што чакаюць іх наперадзе, будзіць іх уласна эстэтычную свядомасць, здатную актыўна ўплываць на жыццё народа іменна дзякуючы «вылучанасці» сваіх законаў, дзякуючы «эмансіпіраванасці» сваёй мастацкай прыроды» [3, с. 102].

Літаратурная традыцыя Максіма Багдановіча як цэласная ідэйна-эстэтычная праграма цалкам скіравана на перспектыву, на будучыню. Цікава, што гэта адчулі ўжо сучаснікі паэта: у сваіх успамінах В. Ластоўскі адзначае, што ў 1911 г., прыехаўшы ў Вільню, Багдановіч «глыбей сягаў думкай у будучыню нашага народа, чым мы, працаўнікі, згрупаваныя ў цэнтры» [7, с. 28]. Паэт, па сутнасці, першы звярнуў увагу і ўласнай дзейнасцю яскрава праілюстраваў паскоранасць развіцця нацыянальнай літаратуры (пазней паскоранасць як завершаная канцэпцыя была абгрунтавана на беларускім матэрыяле В. Каваленкам [6]).

Вызначаныя намі характарыстыкі і асноўныя стрыжнёвыя ідэі літаратурнай традыцыі Максіма Багдановіча даюць новыя ключы для разумення спадчыны паэта, для спасціжэння яе як сістэмнага ўтварэння, дзе ўсе элементы ўзаемазвязаны паміж сабою.

Разгляд літаратурнай традыцыі Максіма Багдановіча як цэласнай ідэйна-эстэтычнай праграмы выводзіць разуменне паэтавай творчасці на абагульняльна-сістэматызуючы ўзровень — метаўзровень, пры якім зводзяцца ў комплекс усе найбольш значныя ідэі, вылучаныя багдановічазнаўствам болей як за дзевяноста гадоў. Такі падыход дазваляе з большай пэўнасцю вызначыць месца і ролю паэта ў нацыянальнай літаратуры, зірнуць на дасягнутае М. Багдановічам не ў нейкім адным часавым зрэзе, а ў гістарычных рэтраспектыве і перспектыве. Пры ім вызначаюцца ідэйныя асновы і галоўныя кірункі ўздзеяння Багдановічавай спадчыны на развіццё беларускага мастацкага слова ў XX ст. Калі выкарыстоўваць зробленыя тут высновы пры непасрэдным аналізе літаратурных традыцый Максіма Багдановіча ў паэзіі таго ці іншага аўтара, можна пазбегнуць дробных, бессістэмных і часцей за ўсё малаплённых у навуковым плане пошукаў тэкставых паралелей і падабенстваў, забяспечыўшы затое якасную ацэнку ступені сутнаснай пераемнасці паміж Багдановічам і паэтам-наступнікам.

Мікалай Грынчык заўважыў: каб паказаць засваенне традыцыі, «няма неабходнасці шукаць [...] адпаведных аналогій ці простых супадзенняў, што надзвычай звужае значэнне гэтай складанай з'явы. Пераемнасць традыцый у творчасці пісьменніка — не вынік асабістых схільнасцей ці густаў, яна сваімі вытокамі шчыльна спалучаецца з вядучымі грамадска-палітычнымі працэсамі, а таму выводзіць за межы прыватных супадзенняў ці падабенства творчай манеры» [4, с. 83—84]. На наш погляд, літаратурная традыцыя Багдановіча, спалучыўшы ў сабе два пачаткі (па-першае, класічнасць, зварот да выпрабаваных часам эстэтычных прынцыпаў, па-другое — унутраную скіраванасць на будучыню, перспектыву), засвойвалася беларускімі аўтарамі якраз у цэласнасці сваіх ідэйна-эстэтычных элементаў. Фактар цэласнасці стаў вызначальным для сілы і кірункаў таго ўплыву, які зрабіў Максім Багдановіч на айчынную літаратуру ў XX стагоддзі.

## Літаратура


1. Багдановіч М. Поўны збор твораў: У 3 т. Т. 1. Мн., 1992.
2. Багдановіч М. Поўны збор твораў: У 3 т. Т. 2. Мн., 1993.
3. Бярозкін Р. Чалавек на прадвесні: Расказ пра Максіма Багдановіча. Мн., 1989.
4. Грынчык М. Максім Багдановіч і народная паэзія. Мн., 1963.
5. Кабаковіч А. Паэзія Максіма Багдановіча: Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага. Мн., 1978.
6. Каваленка В. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць: Развіццё беларускай літаратуры XIX—XX стст. Мн., 1975.
7. На суд гісторыі: Успаміны, дыялогі. Мн., 1994.
8. Лойка А. Максім Багдановіч. Мн., 1966.
9. Навуменка І. Максім Багдановіч. Мн., 1997.
10. Багдановіч М. Вянок паэтычнай спадчыны. Нью-Ёрк—Мюнхэн, 1960.
11. Стральцоў М. Перад дарогай: Апавяданні, аповесці. Мн., 1994.
12. Чорны К. Збор твораў: У 8 т. Т. 8. Мн., 1975.
13. Rich V. Maksim Bahdanovich in Byelorussian Literature // The Journal of Byelorussian Studies. 1965. № 1. P. 36—50.


*T. I. VABISHCHEVICH*

**MAKSIM BAHDANOVICH'S LITERARY TRADITION AS AN IDEOLOGIC AND AESTHETIC PROGRAMME**

## Summary

The necessity of investigating Maksim Bahdanovich's heritage as an integral ideologic and aesthetic programme for development of the national literature is substantiated. It is shown that the conception of Europeanization of the Byelorussian literature constitutes the basis of Bahdanovich's programme. The great attention is paid to the main elements of the poet's literary tradition and interrelations between them.